DOCENDO DISCIMUS
MCMX

# МЫ і ЧАС

№ 19 (231)
СУБОТА,
18 ЛІСТАПАДА
2017 ГОДА

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

В НОМЕР

## НАМ ПИШУТ

Студенты и преподаватели Новгородского государственного университета имени Ярослава Мудрого не первый раз приезжают в наш вуз и всегда остаются довольны временем, проведенным здесь. В этом году новгородская делегация посетила наш университет в конце октября, и, несмотря на то, что время пребывания гостей в Витебске было ограничено, они успели многое. Для новгородцев были организованы мастер-классы и тренинги, круглые столы и лекции, творческие встречи и спортивные мероприятия.

Через некоторое время на адрес нашей альма-матер и лично ректора А.В. Егорова пришло благодарственное письмо за подписью проректора по международной деятельности НовГУ М.Н. Певзнера. В письме высказываются слова благодарности за теплый и радушный прием, отмечается также, что поездка в Витебск оставила у всех участников неизгладимые впечатления, а участие в мастер-классах, практических занятиях и презентациях, посещение лабораторий и учебных мастерских обогатили и вдохновили студентов и преподавателей.

«Сердечно благодарим В.И. Турковского и других коллег за размещение в комфортабельном общежитии и прекрасную организацию визита», – говорится в письме.

***

На адрес нашего вуза и лично ректора А.В. Егорова пришло письмо из управления Следственного комитета Республики Беларусь по Витебской области за подписью заместителя начальника полковника юстиции И.В. Метелицы. В письме высказываются слова благодарности за оказанную помощь и высокое качество проведения лекционных занятий по идеологической подготовке с сотрудниками и гражданским персоналом управления и территориальных подразделений области преподавателям университета: Ю.Л. Поташевой, старшему преподавателю кафедры прикладной психологии, А.Н. Костючкову, старшему преподавателю кафедры социально-гуманитарных наук, Т.Ф. Дмитриевой, доценту кафедры уголовного права и уголовного процесса, и Р.В. Тимофееву, доценту кафедры истории Беларуси.

«СТУДЕНТ ГОДА – 2017»

# КОНКУРС, В КОТОРОМ НЕТ ПРОИГРАВШИХ




**На снимке: победитель областного этапа республиканского конкурса «Студент года – 2017» Руслан Новиков.**

Ох, что происходило в актовом зале нашего университета в пятницу 10 ноября! Пожалуй, давненько стены главного корпуса не видели такого накала страстей, когда группы поддержки из шести вузов Витебщины пришли болеть за своих представителей на областном этапе республиканского конкурса «Студент года – 2017». Да не просто болеть, а аплодировать, размахивать флагами своих университетов и громко кричать имя своего участника.

«Марк, ты – лучший», «Саша, давай!», «Кирилл, мы за тебя!» – несомненно, каждый болел за своего конкурсанта. Переживали за ребят не только студенты, но и преподаватели и руководство вузов, которые также присутствовали в зале.

«Сегодня на сцене не будет проигравших, – отметила проректор нашего университета, доктор экономических наук, профессор В.В. Богатырёва. – Вы все уже победители».

За возможность представить Витебскую область на республиканском конкурсе «Студент года – 2017» боролись: Александра Жаврид (Витебский государственный ордена Дружбы народов медицинский университет), Руслан Новиков (Витебский государственный технологический университет), Марк Сергеев (Полоцкий государственный университет), Валерия Романова (Витебская ордена «Знак Почета« государственная академия ветеринарной медицины), Вероника Босакова (Витебский филиал УО ФПБ «Международный университет "МИТСО"») и Кирилл Макаров – студент второго курса педагогического факультета нашего университета.

«Беларусь – крыніца натхнення» – именно так звучала тема областного этапа, во время которого участники должны были заранее подготовить портфолио и видеоролик о себе (заочный этап), а затем на сцене достойно представить себя. Юноши и девушки также демонстрировали свои таланты и эрудицию в творческом и интеллектуальном конкурсах.

Мое субъективное мнение таково: три лидера состязания определились сразу, поэтому главная интрига заключалась в том, как жюри распределит баллы и у кого их окажется больше.

**(Окончание на 3-й стр.)**




## ЦЕНТР СЛАВЯНСКИХ ЯЗЫКОВ И КУЛЬТУР ПРИГЛАШАЕТ

Как провести свободное время с пользой? Уверена, многие студенты задаются этим вопросом. Центр славянских языков и культур, который действует на ФлФ, предлагает отличное решение данной проблемы. Раз в две недели проходят просмотры фильмов на польском языке. Приглашаем всех желающих изучать польский язык или углубить уже имеющиеся знания.

Центр славянских языков и культур – отличная возможность послушать живую польскую речь, обсудить фильм с интересными людьми и отдохнуть от привычного заучивания, без которого не обходится изучение иностранного языка. Фильмы выбираются путем голосования, как и день проведения мероприятия. Следите за новостями в нашей группе «Центр славянских языков и культур» Вконтакте.

**Карина ЗАВАЦКАЯ,
студентка 4 курса ФлФ.**



## «МЫ і ЧАС» – ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС!

**Нагадваем, што працягваецца падпіска на першае паўгоддзе 2018 года на газету «Мы і час».**

**Выданне можна выпісаць у любым аддзяленні сувязі Рэспублікі Беларусь. Падпісны індэкс – 64098. Заставайцеся з намі!**

ОТКРЫТЫЙ ДИАЛОГ

# К 100-ЛЕТИЮ РЕВОЛЮЦИИ

В нашем университете в начале ноября прошел открытый диалог «Дыхание истории: сто лет спустя», приуроченный к 100-летию Октябрьской социалистической революции.

На открытый диалог, организованный Первомайским районным комитетом ОО «БРСМ» совместно с администрацией Первомайского района города Витебска и первичной организацией ОО «БРСМ» ВГУ имени П.М. Машерова, пришли эксперты, студенты, представители ветеранских и общественных организаций. Собравшихся поприветствовал исполняющий обязанности первого секретаря Первомайского районного комитета ОО «БРСМ» Святослав Михайлов, который взял на себя функцию модератора открытого диалога.

В рамках мероприятия обсуждались роль Октябрьской революции в жизни общества, взаимосвязь Первой мировой войны и Октябрьской и Февральской революций, жизнь жителей Витебска и их отношение к Первой мировой войне и революционным событиям 1917 года и многое другое.









Например, декан факультета экономики и права Международного университета «МИТСО» Виктор Владимирович Окуневич отметил, что Октябрьская революция – это наша история. Конечно, к ней можно относиться по-разному, но вычеркнуть из прошлого невозможно.

Виктор Владимирович рассказал, что к 1917 году наш город был очень перенаселен. Помимо гражданского населения в Витебске проживали военные и беженцы. На всех не хватало жилья, работы, продуктов, врачей, которые могли бы оказать квалифицированную медицинскую помощь. Поэтому неудивительно, что жители Витебска встречали революционные события с радостью и надеждой на то, что теперь их жизнь изменится.

Интересную информацию об Октябрьской и Февральской революциях можно отыскать в Витебской областной библиотеке имени В.И. Ленина. Об этом рассказала заведующий отделом краеведческой литературы и библиографии Лариса Ивановна Рогачёва.

Ровесником революции в нашем городе принято считать областную газету, первый номер которой вышел 11 ноября 1917 года. Заведующий отделом писем и права областной газеты «Витебские вести» Наталья Камлёва отметила, что 100 лет назад издание называлось «Известия Витебского революционного Совета солдатских и рабочих депутатов», затем долгое время региональная газета носила название «Віцебскі рабочы», правопреемником которой сегодня являются «Витебские вести».

С праздником всех присутствовавших поздравил первый секретарь областного комитета Коммунистической партии Беларуси Александр Леонидович Дединкин.

Чтобы проникнуться духом эпохи и понять, какое значение в жизни наших предков имела революция, участникам круглого стола были показаны архивные кадры демонстрации, которая прошла в Витебске в 1918 году в честь первой годовщины Октября. А после этого свои знания об Октябрьской революции и о жизни в СССР смогли продемонстрировать студенты, для которых ведущий подготовил несколько каверзных вопросов.

**P.S.** Круглый стол «Октябрь 1917 года в судьбах людей, народов, государств» прошел на историческом факультете нашего университета. Перед собравшимися студентами выступили не только преподаватели факультета, но и приглашенные эксперты: ведущий архивист Государственного архива Витебской области Светлана Николаевна Мясоедова, декан факультета экономики и права Витебского филиала Международного университета «МИТСО» Виктор Владимирович Акуневич, заведующий витебским Художественным музеем Ольга Ивановна Акуневич, главный специалист главного управления идеологической работы, культуры и по делам молодежи Витебского областного исполнительного комитета Денис Валерьевич Юрчак. Присутствовавшие студенты смогли задать интересующие их вопросы и даже вступить в дискуссию.

**НАШ КОРР.**

**На снимках:** во время открытого диалога.

**Фото А. ЛАЗЕБНОЙ.**

З НАГОДЫ

# ШЧЫРЫЯ СЛОВЫ ПРА НЯЎРЫМСЛІВАГА ЧАЛАВЕКА

Напэўна, няма ў нашым горадзе такога чалавека, які б не ведаў Аркадзя Уладзіміравіча Русецкага. Сталыя людзі ўзгадваюць той час, калі ён працаваў на адказных камсамольскіх і партыйных пасадах, у Віцебскім гарвыканкаме. Маладое пакаленне ведае Аркадзя Уладзіміравіча як экс-рэктара ВДУ імя П.М. Машэрава, доктара гістарычных навук, прафесара, аўтара шэрага кніг, прысвечаных мастацкай культуры Беларусі.

Першага лістапада наш знакаміты зямляк адзначыў свой 75-гадовы дзень нараджэння. Збіраючыся на ўрачыстую імпрэзу, якую арганізавалі прафкам працоўных (старшыня Дзмітрый Алегавіч Стрык) і рэктарат універсітэта на чале з рэктарам Аляксеем Уладзіміравічам Ягоравым, я ўзгадвала сваё знаёмства з гэтым няўрымслівым чалавекам. Адбылося яно ў 1996 годзе на І Усебеларускім народным сходзе, на якім Аркадзь Уладзіміравіч быў адным з дэлегатаў ад Віцебшчыны...

Ідучы ў залу нарад, дзе мелася адбыцца ўрачыстасць, я ўспамінала, як мы разам з А.У. Русецкім узнаўлялі нашу газету. Рэктар як галоўны рэдактар выдання ніколі не рабіў заўваг. Аркадзь Уладзіміравіч давяраў не толькі мне, але і тым людзям, якія з ім працавалі ва ўніверсітэце. Безумоўна, гэта акрыляла: хацелася выконваць сваю працу на самым высокім узроўні і на старонках газеты «Мы і час» у поўным аб'ёме адлюстроўваць палітыку ВНУ.







Амаль дванаццаць гадоў Аркадзь Уладзіміравіч узначальваў нашу альма-матар. Віншуючы юбіляра, А.У. Ягораў адзначыў, што, дзякуючы высокаму прафесіяналізму, дзяржаўнаму мысленню, уменню прымаць узважаныя рашэнні, патрабавальнасці да сябе, уважлівым адносінам да людзей, А.У. Русецкі займеў вялікі аўтарытэт сярод супрацоўнікаў ВДУ імя П.М. Машэрава. Аркадзь Уладзіміравіч – гэта той чалавек, да якога заўсёды можна звярнуцца па слушную параду ці дапамогу.

«Вы, як вопытны і аўтарытэтны кіраўнік, былі гарантам паспяховага развіцця ўніверсітэта. Пад Вашым кіраўніцтвам наша ВНУ не толькі пераадолела ўсе цяжкасці, але і атрымала якасна новы імпульс развіцця, стаўшы адным з найлепшых класічных універсітэтаў Рэспублікі Беларусь», – зазначыў Аляксей Уладзіміравіч. Юбіляр, паказваючы рукой на дэканаў, прамовіў: «Што я?! Я толькі кіраваў, гэта яны ўсё рабілі».

Напрыканцы свайго выступлення А.У. Ягораў пажадаў А.У. Русецкаму невычэрпнай энергіі, доўгай жыццёвай дарогі, напоўненай яркімі падзеямі, новымі дасягненнямі ды поспехамі, а таксама радасці ад стасункаў з тымі, хто прафесара любіць і паважае.

Сапраўды, Аркадзя Уладзіміравіча любяць і паважаюць ва ўніверсітэце. І ёсць за што... Гартаючы пажоўклыя старонкі газет, звяртаеш увагу на невялічкія нататкі, што адлюстроўваюць яркія падзеі мінулых гадоў, і ловіш сябе на думцы: колькі ў А.У. Русецкага было цікавых ідэй і прапаноў, якія поўнасцю ажыццявіліся, колькі ім пакладзена традыцый, на якіх і сёння выхоўваюць студэнтаў. Рэктар вельмі клапаціўся пра моладзь і пра будучыню ўніверсітэта. За гады яго кіраўніцтва было ўведзена шмат новых спецыяльнасцей, заснаваны юрыдычны факультэт. Усё гэта рабілася для таго, каб наша ВНУ стала класічным універсітэтам.

У юбілейны дзень нараджэння Аркадзя Уладзіміравіча віншавалі старшыня Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр Сяргеевіч Суханаў, дэкан гістарычнага факультэта Веніямін Аркадзьевіч Космач, дэкан факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі Сяргей Анатольевіч Маторaў, дэкан юрыдычнага факультэта Аляксандр Аляксандравіч Бачкоў. Ад імя дэканаў нашай ВНУ букет руж юбіляру ўручыла дэкан педагагічнага факультэта Іна Анатольеўна Шарапава, якая таксама перадала прывітанне і шчырыя віншаванні ад творчых калектываў факультэта. Віталь Якаўлевіч Кузьменка, кіраўнік біялагічнага факультэта, праспяваў куплет і прыпеў з гімна ўніверсітэта, словы якога напісаў А.У. Русецкі.

На роднай мове павіншавала Аркадзя Уладзіміравіча прарэктар па выхаваўчай рабоце Ірына Васільеўна Бондал, якая прыгадала самыя яркія моманты сумеснай працы, дзякавала юбіляру за падтрымку і парады. Шчырыя, цёплыя словы прарэктара, думаю, запалі ў душу не толькі віноўніку ўрачыстасці, але і ўсім прысутным. Выступленне Ірыны Васільеўны дапоўніў прарэктар па вучэбнай рабоце Веслаў Іосіфавіч Туркоўскі, які адзначыў, што дзякуючы Аркадзю Уладзіміравічу ва ўніверсітэце былі праведзены рамонтныя работы. Прарэктар засяродзіў таксама ўвагу на кніжнай спадчыне прафесара.

Слухаючы кожнага выступоўца, я раптам злавіла сябе на думцы, што віншуюць не былога кіраўніка нашай альма-матар, філосафа, вучонага, пісьменніка, а выказваюць словы падзякі самаму блізкаму і дарагому чалавеку, з якім было прыемна працаваць і адпачываць, удзельнічаць у розных мерапрыемствах, чалавеку, які абагачае духоўна і інтэлектуальна не толькі Віцебшчыну, але і ўсю нашу краіну.

Даўгалецця Вам, шаноўны Аркадзь Уладзіміравіч, творчага натхнення, здароўя!

**Настасся ЛАЗЕБНАЯ.**

**P.S.** На пачатку вечара своеасаблівы падарунак зрабіў былы супрацоўнік універсітэта Ф.А. Грынеўскі, які стварыў і паказаў біяграфічную кінастужку пра юбіляра.

**На здымках:** *(уверсе злева направа)* рэктар А.У. Ягораў уручае віншавальны адрас і ганаровую грамату ўніверсітэта А.У. Русецкаму; А.С. Суханаў, старшыня Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, віншуе юбіляра; *(унізе)* здымак на памяць.

**Фота аўтара.**

17 НОЯБРЯ – МЕЖДУНАРОДНЫЙ ДЕНЬ СТУДЕНТА

# НЕЗАБЫВАЕМОЕ ВРЕМЯ

Накануне Международного дня студента, который празднуется 17 ноября, мы решили спросить у преподавателей нашего университета, какие самые яркие воспоминания о студенческих годах у них остались.

***Сергей Александрович Прохожий, доцент кафедры информатики и информационных технологий:*** «На нашем математическом факультете культурная жизнь всегда била ключом. На старших курсах учились "звезды", на которых постоянно хотелось равняться. Среди них – Виталий Шляппо, сегодня успешный продюсер и сценарист многих популярных проектов, в том числе сериалов "Папины дочки", "Даёшь молодёжь", "Кухня" и др.

Мы же с моим товарищем, тоже студентом математического факультета, Сергеем Красавцевым играли на музыкальных инструментах и пели популярные в то время композиции, к примеру, песню "Стильный оранжевый галстук" группы "Браво". Затем мы создали группу из трех Сергеев: к нашему дуэту присоединился Сергей Грош (филологический факультет). У нас даже сольный концерт в университете состоялся. Человек сто тогда собралось. На других площадках мы тоже выступали и даже записали на студии пол-альбома».

***Михаил Леонидович Цыбульский, доцент кафедры изобразительного искусства:*** «Студэнты мастацка-графічнага факультэта заўсёды былі і застаюцца своеасаблівымі людзьмі. Таму мы практычна ніколі не святкавалі Міжнародны дзень студэнта, а адзначалі свае, "прафесійныя" святы, звязаныя з мастацкімі і культурнымі падзеямі, напрыклад, Дзень стварэння УНОВІСа ці Дзень нараджэння Казіміра Малевіча. Гэта былі нашыя своеасаблівыя дні студэнтаў. Падчас такіх свят мы збіраліся разам, ставілі на стол гарбату (і не толькі), дэкламавалі, чыталі ўспаміны мастакоў і г.д. Любая мастацкая падзея, асабліва звязаная з авангардам, андэграўндам ці чымсьці забароненым, магла стаць нагодай сабрацца разам і абмеркаваць. Студэнты МГФ заўсёды адчувалі сваю прыналежнасць да мастацтва, і гэта праяўлялася ва ўсім, нават у святах».

**Алеся ДУБРОВСКАЯ.**

# КОНКУРС, В КОТОРОМ НЕТ ПРОИГРАВШИХ



**На снимке: Кирилл Макаров и Виктор Глушин.**


**На снимке: финалисты областного этапа конкурса.**

**(Окончание. Начало на 1-й стр.)**

Злую шутку с участниками сыграли штрафные баллы, которые начислялись каждому, кто превышал временной лимит своего выступления.

Наверняка немалую роль в определении победителя сыграл и интеллектуальный конкурс. Ведь если к творческому состязанию все подготовились дома, то здесь ребятам пришлось основательно подумать и четко выразить свое отношение к высказываниям белорусских писателей.

Несомненно, членам жюри во время конкурса было непросто. В этом признался председатель жюри – первый секретарь областного комитета БРСМ Виктор Глушин во время поздравления победителей: «Лично я для себя так и не смог определить, кто лучший из трех ребят, которые мне сегодня понравились».

С Виктором Валерьевичем я полностью согласна. Думаю, это мнение разделяли и присутствовавшие в зале болельщики. Разумеется, стать победителем мог каждый, но выставленные членами жюри оценки расставили все на свои места.

Так, в номинации «Мисс Обаяние» диплом получила Вероника Босакова, в номинации «Мисс Творчество» – Валерия Романова. Третье место занял Марк Сергеев, а вот на втором оказались сразу два студента – Кирилл Макаров и Александра Жаврид. Победителем областного этапа стал студент второго курса ВГТУ Руслан Новиков. Он же набрал больше всего голосов в онлайн-голосовании на Витебском городском портале.

Все финалисты получили призы от спонсоров конкурса, а Руслану досталась еще и путевка в Стокгольм от туристической фирмы «Илва».

«Я один из самых молодых участников и, если честно, не ожидал, что смогу победить сегодня, – признался Руслан Новиков. – Теперь моя главная задача – достойно представить Витебщину на республиканском этапе. Надеюсь, вся область объединится и поддержит меня».

К слову, республиканский этап конкурса «Студент года – 2017» пройдет в Минске в начале декабря. И вполне возможно, что кроме Руслана Новикова в столице смогут выступить и другие представители нашего региона. Кто знает, возможно, это будет наш Кирилл Макаров…

А пока поздравляем всех финалистов областного этапа и, конечно же, победителя – Руслана Новикова.

**Алеся ДУБРОВСКАЯ.**
**Фото автора.**

2017 ГОД – ГОД НАВУКІ

# ПЕРШЫ І АДЗІНЫ Ў СВЕЦЕ






У Нацыянальнай акадэміі навук 26 кастрычніка быў прадстаўлены 37-томны "Гістарычны слоўнік беларускай мовы". У прэзентацыі прынялі ўдзел некалькі дзясяткаў навукоўцаў з усёй краіны, у тым ліку кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава Алена Сяргееўна Дзядова.

Выданне, над распрацоўкай ідэі і стварэннем якога на працягу 90 год працавала некалькі пакаленняў навукоўцаў, па праве можна лічыць праектам стагоддзя. На сённяшні дзень яно не мае аналагаў ні ў нашай краіне, ні за яе межамі. У 37 тамах змешчана 75 тысяч слоў, якія зафіксаваны ў помніках XIV – XVIII стагоддзяў і якія адлюстроўваюць гісторыю беларусаў на працягу 500 год. Базай слоўніка сталі статуты, летапісы, дзелавая, навуковая, мемуарная літаратура, рэлігійныя помнікі.

Над стварэннем картатэкі, што налічвала 1 мільён 60 тысяч картак, каманда навукоўцаў пад кіраўніцтвам загадчыка аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства АН БССР Аркадзя Жураўскага працавала ў 1960-х гадах. Першы слоўнік, суаўтарам і рэдактарам якога стаў Аляксандр Булыка, быў надрукаваны ў 1982 годзе. З гэтага часу пад рэдакцыяй мовазнаўца слоўнікі выдаваліся штогод.

«Першапачаткова планавалася выдаць 40 кніг, але пазней было прынята рашэнне скараціць іх колькасць да 37. Няпроста далося нам складанне картатэкі, над якой мы працавалі больш за 20 год, паколькі матэрыялы даследаванняў знаходзіліся ў Маскве, Рызе, Львове, Вільнюсе, Кіеве, Кракаве, Варшаве. Літаральна кожнае слова, змешчанае ў 37 тамах, перад публікацыяй я аналізаваў і абдумваў, таму гэтая праца для мяне і маіх калег фундаментальная», – распавёў мовазнаўца, трымаючы ў руках апошні том «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы». Дарэчы, нягледзячы на сталы ўзрост, Аляксандр Булыка, які ў свой час быў выкладчыкам А.С. Дзядовай, працягвае навуковую дзейнасць. Зараз ён працуе над стварэннем гістарычна-этымалагічнага слоўніка іншамоўных слоў старабеларускай мовы.

Практычная значнасць «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы», як зазначыў дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ігар Капылоў, надзвычай вялікая. Выданне карыстаецца папулярнасцю сярод гісторыкаў, культуролагаў, архівістаў, мае вялікую навуковую каштоўнасць для даследчыкаў-мовазнаўцаў, паколькі адкрывае новыя магчымасці для вывучэння лексікалогіі, старажытнай фанетыкі, словаўтварэння. «Мае слоўнік і вялікае агульнадзяржаўнае значэнне. Прынята лічыць, што нацыя сцвердзілася тады, калі ў яе ёсць пераклад на нацыянальную мову Бібліі. А я яшчэ дадам: калі ёсць гістарычны слоўнік. Беларусы ў гэтым плане апярэдзілі многія народы, у тым ліку краіны-суседзі, бо слоўнік рускай мовы XI – XVII стагоддзяў, а таксама "Гістарычны слоўнік украінскай мовы" яшчэ не завершаны», – адзначыў Ігар Капылоў.

Існуе думка, што сучасная беларуская літаратурная мова цалкам заснавана на народных гаворках – дыялектах. Слоўнік жа даказвае, што пераемнасць паміж старабеларускай і сучаснай мовамі існуе, прычым не толькі ў вуснай форме, але і ў пісьмовай.

«Напрыклад, словы "мыта" і "мытнік" з'явіліся адносна нядаўна, але яны шырока ўжываліся ў старабеларускай мове ў XIV – XVII стагоддзях. Шмат слоў, якія змешчаны ў "Гістарычным слоўніку", у хуткім часе могуць пранікнуць у мову і стаць літаратурнай нормай», – падкрэсліў Ігар Капылоў.

На сённяшні дзень поўнае выданне «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы» набыць амаль немагчыма, паколькі першы том выйшаў 40 год таму. Але ў бліжэйшых планах інстытута правесці алічбоўку тамоў, якіх пакуль няма ў электронным варыянце, каб імі маглі карыстацца ўсе ахвотныя. А пакуль слоўнік можна пабачыць у навуковай бібліятэцы ВДУ імя П.М. Машэрава.

**Юлія ГАЎРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара.**

АКТУАЛЬНО

# ЗАЩИТА ПРАВ БЕЗ СУДА

Всем известно: если наши права были нарушены, следует обратиться в суд. Однако существуют и другие способы защиты своих прав, позволяющие не доводить дело до суда. Речь идет в первую очередь о третейских судах и медиации.

Специалисты нашего университета с осени этого года активно осуществляют инициативу «Защита прав без суда» в Толочинском районе. Она выполняется в рамках проекта «Содействие развитию на местном уровне в Республике Беларусь», который финансируется Европейским Союзом и реализуется Программой развития ООН при всесторонней поддержке администрации района.

За время существования инициативы был проведен целый ряд образовательных мероприятий, в ходе которых команда специалистов в составе адвоката, медиатора, психолога, третейского судьи и юриста информировала руководителей предприятий и жителей Толочинского района о возможностях разрешать гражданские конфликты во внесудебных инстанциях и о преимуществах медиации и третейского суда.

По сравнению с судебным рассмотрением споров у медиации существует целый ряд преимуществ: возможность сохранить человеческие и деловые отношения, снять психологическую и эмоциональную нагрузку, принять справедливое решение, основанное на интересах участников. При этом стороны могут контролировать процесс переговоров, экономя время и деньги. Часто в ходе медиации принимаются нестандартные и гибкие решения, а также всегда соблюдается конфиденциальность.

О преимуществах третейского судопроизводства на примере первого в Витебске третейского суда ВГУ имени П.М. Машерова рассказал его председатель Игорь Иванович Шматков, заведующий кафедрой гражданского права и гражданского процесса.

Постоянно действующий третейский суд при нашем университете был зарегистрирован 28 мая 2012 года главным управлением юстиции Витебского облисполкома. Третейский суд создан для защиты интересов граждан и субъектов хозяйствования. Среди его преимуществ можно выделить следующие: оперативность и экономичность рассмотрения дела, конфиденциальность, более низкая стоимость обращения в суд, возможность сторонам самим определить сроки, место и время разрешения спора, сохранение партнерских отношений между спорящими сторонами.

Третейским судом принимаются к рассмотрению споры при наличии третейского соглашения, которое заключается в письменной форме. Это может быть как отдельный документ, подписанный сторонами третейского соглашения, так и обмен сообщениями с использованием почтовой или иных видов связи.

Решение третейского суда является обязательным для сторон. Исполняют его государственные органы принудительного исполнения по правилам исполнительного производства, установленным гражданским процессуальным или хозяйственным процессуальным законодательством Республики Беларусь.

Ректор нашего университета А.В. Егоров высоко оценил результаты инициативы «Защита прав без суда». При этом Алексей Владимирович подчеркнул, что наш вуз должен и дальше повышать правовую грамотность населения, в том числе и путем информирования о появившихся альтернативных возможностях.

**Екатерина СЕРДЕЧНАЯ,**
**студентка 3 курса ФлФ.**

# НЕЧАКАНЫ ВОСЕНЬСКІ ПАДАРУНАК

Гэтая восень была для мяне багатай на сюрпрызы. Адным з іх стаў удзел у ІІ Міжнародным моладзевым фестывалі-конкурсе паэзіі і паэтычных перакладаў, што праходзіў у межах VII Міжнароднага фестывалю нацыянальных культур «Берега дружбы» на пачатку кастрычніка ў Неклінаўскім раёне Растоўскай вобласці.

Заяўку на ўдзел мы з кіраўніком – кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам кафедры літаратуры нашага ўніверсітэта, паэткай Вольгай Іванаўнай Русілка дасылалі яшчэ ўлетку. Згодна з умовамі конкурсу неабходна было ў творчых парах (настаўнік – вучань) перакласці творы ўкраінскіх і расійскіх паэтаў. Мне дасталіся вершы маіх аднагодак з Расіі Тацьцяны Краўчанка і Ангеліны Лазаравай, а Вольга Іванаўна працавала з творамі паэткі Вольгі Жураўлёвай (Расія).

Па выніках гэтага завочнага этапу мы сталі фіналістамі і нас запрасілі на фестываль. Рэспубліку Беларусь на ім прадстаўлялі 18 чалавек, у тым ліку і я. Узначальваў каманду У.М. Гаўрыловіч, старшыня Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. На заключным этапе мы зачытвалі нашы пераклады. Акрамя гэтага, для нас, канкурсантаў, была прадугледжана насычаная культурная праграма. Мы наведалі школы раёна, дзе чыталі вершы, знаёміліся з дзецьмі і настаўнікамі, размаўлялі на розныя тэмы. Напрыклад, я разам з дзвюма пісьменніцамі з Луганскай Народнай Рэспублікі і Расійскай Федэрацыі пабывала ў Натальеўскай сярэдняй школе. Для ўдзельнікаў фестывалю-конкурсу былі арганізаваны таксама літаратурныя гасцёўні, майстар-класы па паэзіі, розныя экскурсіі. Я нават і не марыла пра тое, што калісьці змагу пабываць у доміку А.П. Чэхава! Запомнілася ўсім і адкрыццё бібліятэкі імя Івана Мележа ў пасёлку Пакроўскае. Прынялі ўдзел мы і ў фестывалі нацыянальных культур, пазнаёміліся з сучаснымі казакамі, пакаштавалі сапраўдную казацкую юшку ў гэтым жа пасёлку.



Круглыя сталы «Сацыякультурная ідэнтычнасць у паэзіі Расіі, Беларусі, Украіны» і «Вольны мікрафон» чакалі нас у Данской дзяржаўнай публічнай бібліятэцы. А на памяць пра сябе мы заклалі «Пісьменніцкі сквер», пасадзіўшы дрэвы ля храма іконы Божай Маці ў сяле Дараганаўка Неклінаўскага раёна.

Падчас фестывалю панавала цёплая, сяброўская атмасфера. Удзельнікі з розных краін знаёміліся, дзяліліся ўражаннямі, знаходзілі новых сяброў. А па-іншаму і быць не магло, бо ўсіх нас яднілі любоў да паэзіі, пазітыўнае стаўленне да жыцця, адчуванне прыгажосці ў кожным імгненні. Штовечар мы збіраліся вялікай кампаніяй на беразе Азоўскага мора, непадалёку ад якога жылі, і спявалі песні пад гітару. Незабыўны час!

Вярталася на Радзіму я шчаслівая і не з пустымі рукамі, а з дыпломам фіналіста, дыпломам лаўрэата трэцяй ступені, падзякай ад Саюза пісьменнікаў Расіі, а таксама з сувенірамі, зробленымі рукамі мясцовага харунжага і прадстаўнікоў дэлегацыі з Кабардзіна-Балкарыі. І, канешне ж, са мной засталіся цудоўныя ўспаміны, якія яшчэ доўга будуць выклікаць усмешку на маім твары.

**Ірына РАДЗІХОЎСКАЯ, студэнтка 3 курса ФлФ.**

**На здымку:** Ірына Радзіхоўская са сваім кіраўніком Вольгай Іванаўнай Русілка.

**Фота А. ДУБРОЎСКАЙ.**

# ЛЯЎКІ: ПОЗІРК У МІНУЛАЕ

Сёлета адзначаецца 135 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі, драматурга, публіцыста, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальнай акадэміі навук Украіны Янкі Купалы.



З гэтай нагоды мы, студэнты філалагічнага факультэта спецыяльнасці «Беларуская філалогія», на чале з дацэнтам кафедры беларускага мовазнаўства Галінай Канстанцінаўнай Семяньковай і дацэнтам кафедры літаратуры Віталем Феліксавічам Падстаўленкам накіраваліся на экскурсію ў вёску Ляўкі, каб яшчэ больш даведацца пра жыццё і творчасць класіка беларускай літаратуры. Менавіта тут, у вёсцы Ляўкі, з 1935 па 1941 год Янка Купала стварыў свой вядомы цыкл лірычных вершаў.



Вёска знаходзіцца ў Аршанскім раёне Віцебскай вобласці. Усяго паўтары гадзіны ў дарозе – і вось яно, тое месца, якое ўражвае сваёй непаўторнай прыгажосцю. На жывапісным беразе Дняпра размешчаны музейны комплекс «Ляўкі» – філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. На тэрыторыі комплексу, агульная плошча якой складае 19 гектараў, знаходзяцца будынак былой канторы Копыскага лясніцтва, гаспадарчыя пабудовы, домік шафёра, гараж, у якім стаіць «шэўрале» пісьменніка – аўтамабіль, падараваны ўрадам БССР у 1939 годзе, памятны камень, прывезены з Мінска пасля ўсталявання новага помніка. А галоўным аб'ектам экспазіцыі з'яўляецца рэканструяванае лецішча Янкі Купалы. У Вялікую Айчынную вайну яно было спалена, а пасля адбудавана нанова. Менавіта на лецішчы пісьменнік адпачываў са сваімі сябрамі і блізкімі. У госці да творцы кожны дзень прыходзілі вяскоўцы, да якіх паэт адносіўся з асаблівай шчырасцю і павагай.

«На гэтым месцы, дзе сёння ўсталяваны помнік Янку Купалу, мы збіраліся цёплымі летнімі вечарамі», – успамінаюць вяскоўцы. З асаблівым хваляваннем крочаць яны па знаёмых сцяжынках, каля векавых дубоў, пад якімі, мабыць, калісьці прагульваўся пісьменнік і абдумваў свае геніяльныя творы.

**Ганна ЧАРНЯЎСКАЯ, студэнтка 3 курса ФлФ.**

# ПРЫГАЖОСЦЬ, ЯКУЮ ДОРАЦЬ ПАЭТЫ

У кастрычніку адзначыў свой юбілей адзін з самых вядомых і любімых сучасных беларускіх паэтаў – Леанід Дранько-Майсюк. Вялікім святам для студэнтаў філалагічнага факультэта стаў візіт творцы ва ўніверсітэт. Сустрэча адбылася 17 кастрычніка ў адной з аўдыторый на ФлФ, дзе сабралася шмат студэнтаў і выкладчыкаў, што нават месца ўсім не хапіла.

Творчасць Леаніда Дранько-Майсюка вылучаецца найперш тым, што ў ёй прысутнічаюць непаўторныя фларыстычныя вобразы. Асаблівую ўвагу паэт надае гукаваму ладу сваіх вершаў. Мілагучнасць, вобразная асацыятыўнасць, метафарычнасць – вось тыя рысы, якія перадусім выяўляюцца ў паэзіі Л. Дранько-Майсюка. Але, напэўна, вершы паэта не гучалі б так прыгожа, калі б ён сам іх не чытаў. А чытаў лірык падчас сустрэчы дастаткова шмат. Напрыклад, прагучаў яго вядомы верш «У Вашым голасе квітнеюць астры…»:

*У Вашым голасе квітнеюць астры,*
*Якіх не бачыў я раней.*
*Мне зразумела ўсё і ўсё не ясна...*
*У Вашым голасе квітнеюць астры,*
*І кожнай кветцы Бог сказаў: квітней...*

Пачуўшы верш з вуснаў паэта, ужо не здзіўляешся, чаму даследчыца Ганна Кісліцына назвала Л. Дранько-Майсюка «Арфеем, распятым на струнах ліры». Творца цалкам адданы высокаму мастацтву...

Таленавіты госць прыехаў не адзін, а са сваім сябрам – паэтам і бардам Эдуардам Акуліным, які выконваў уласныя песні. Уся аўдыторыя падпявала яму. Адчувалася, што маладое пакаленне нераўнадушна ставіцца да песень барда:

*Смелая, смелая, смелая,*
*Смелая, як ніхто,*
*Бо апранула белае,*
*Белае паліто...*

Падчас сустрэчы хлопцы і дзяўчаты ахвотна задавалі гасцям пытанні. Прычым апошнія датычыліся не толькі творчасці, але і асабістага жыцця. Напрыклад, у Л. Дранько-Майсюка адна са студэнтак пацікавілася: «Як адрозніць сапраўднае каханне ад звычайнай улюбёнасці?» Паэт адказаў з уласцівым яму гумарам: «Трэба хлопца накарміць. І калі той ухваліць кулінарны талент дзяўчыны, значыць, гэта каханне». А Э. Акуліну задалі правакацыйнае пытанне: з кім лепш праводзіць вечар – з жонкай ці з Леанідам? На што бард імгненна адказаў: «З жонкай Леаніда Дранько-Майсюка». Уся аўдыторыя зарагатала.

Пасля імпрэзы госці ахвотна фатаграфаваліся са студэнтамі і выкладчыкамі, якія, у сваю чаргу, шчыра дзякавалі паэтам за такую неверагодна цёплую, шчырую і атмасферную сустрэчу.

**Лізавета ЯСЮКЕВІЧ, студэнтка 4 курса ФлФ.**



**На здымку: студэнты і выкладчыкі ФлФ з гасцямі.**

# ВЫСТАВА ГАБЕЛЕНАЎ З ЛАТВІІ

Прафесійнай школе тэкстыльнага мастацтва Латвіі 56 гадоў. І менавіта столькі асвойваецца і ткацтва габеленаў ва ўсёй шматграннасці магчымасцей гэтай тэхнікі. У выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта нашага ўніверсітэта можна пазнаёміцца з калекцыяй габеленаў студэнтаў Латвійскай акадэміі мастацтваў, з якой плённа супрацоўнічае факультэт.

Як адзначыла куратар выставы – загадчык кафедры тэкстыльнага мастацтва акадэміі, прафесар Іева Круміня, усе прадстаўленыя на выставе творы – гэта працы, створаныя першакурснікамі розных гадоў. Амаль для ўсіх іх гэта першы габелен у жыцці, таму што рэдка хто прыходзіць з наяўнымі навыкамі ткацтва. Праўда, спачатку ткуцца невялікія ўзоры тэхнік, а далей ідзе самастойная праца над «перакладам» свайго эскіза ў тэкстыльную матэрыю. Найбольш цікавымі з'яўляюцца працы тых аўтараў, якія ў валокнах матэрыялу паспрабавалі распавесці сваю гісторыю, дасягнуўшы непаўторнай вобразнасці ў ткацтве.

Падчас адкрыцця выставы наведвальнікаў сардэчна віталі прарэктар універсітэта В.В. Багатырова, консул Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя, куратар выставы з нашага боку – дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва М.Л. Цыбульскі, загадчык кафедры выяўленчага мастацтва А.А. Сакалова, загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі І.А. Сысоева.

**Фёдар ШКІРАНДА.**

МЫ і ЧАС
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33.
Тэл. 58-97-92. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 17.11.2017 г. у 15.30. Тыраж 800.
Аб'ём 1 друк. арк. Зак. 7176.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць два разы на месяц.

Галоўны рэдактар І.М. ПРЫШЧЭПА
Рэдактар Н.П. ЛАЗЕБНАЯ